ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя У. І. ЛЕНІНА"
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ



# Уладзімір Караткевіч



## у творах мастацтва









Анатаваны біябібліяграфічны паказальнік

Віцебск, 2010

**ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»**
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ
# У ТВОРАХ МАСТАЦТВА

Анатаваны біябібліяграфічны паказальнік

Віцебск, 2010

УДК 016 : 882.6(092) + 882.6(092)
ББК 91.9 : 83.3(4Беи-4Вит)6-8 + 83.3(4Беи-4Вит)6-8я1
К21

Складальнікі : С.У. Заянкоўская, Н.В. Фенчанка
Рэдактары : В.М. Аўсяннікава, В.М. Нявейкава
Адказны за выпуск : А.І. Сёмкін

Уладзімір Караткевіч у творах мастацтва : анатаваны біябібліяграфічны паказальнік / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна", Аддзел беларускай літаратуры ; склад. С.У. Заянкоўская, Н.В. Фенчанка . – Віцебск, 2010. - с.

Выданне "Уладзімір Караткевіч у творах мастацтва" з'яўляецца біябібліяграфічным паказальнікам, прысвечаным творам мастацтва, якія адлюстроўваюць асобу беларускага пісьменніка У.С. Караткевіча як чалавека і творцу. У дапаможнік уключаны анатаваныя бібліяграфічныя запісы на музычныя кампазіцыі, тэатральныя і оперныя пастаноўкі, жывапісныя палотны і скульптурныя работы, кінастужкі, створаныя па матывах літаратурнай спадчыны пісьменніка. Не засталіся па-за ўвагай вершы-прысвячэнні Караткевічу, якія належаць пяру не толькі айчынных, але і замежных паэтаў і празаікаў. Храналагічныя рамкі публікацый – 1965–2010 гады.

Дапаможнік будзе карысным для студэнтаў, даследчыкаў, філолагаў, мастацтвазнаўцаў, супрацоўнікаў бібліятэк і ўсіх тых, хто цікавіцца жыццём і творчасцю класіка беларускай літаратуры.

© ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна", 2010

# АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ

Дадзены дапаможнік, прысвечаны творам мастацтва, якія адлюстроўваюць асобу беларускага пісьменніка У.С. Караткевіча як чалавека і творцу, з’яўляецца спробай стварэння самастойнага біябібліяграфічнага паказальніка.

Выданне адкрываецца ўступным артыкулам Н. Фенчанкі “Рыцар сонечнай стыхіі”. Асноўная частка ўключае 11 раздзелаў : “У.С. Караткевіч і сучасная беларуская мастацкая культура”, “Урачыстасці ў гонар пісьменніка”, “Вобраз У.С. Караткевіча ў выяўленчым мастацтве”, “Музычнае ўвасабленне твораў У.С. Караткевіча”, “Спадчына У.С. Караткевіча ў фондах і калекцыях музеяў”, “Тэатральна-сцэнічнае ўспрыманне У.С. Караткевіча”, “У.С. Караткевіч на радыё і тэлебачанні”, “Экраннае прачытанне твораў У.С. Караткевіча”, “Вобраз У.С. Караткевіча ў літаратуры”, “У.С. Караткевіч – мастак”, “Электронныя рэсурсы аб жыцці і дзейнасці У.С. Караткевіча”.

Запісы размешчаны ў алфавітным парадку і ахопліваюць перыяд з 1965 па 2010 гады. Парадак размяшчэння запісаў у раздзелах “У.С. Караткевіч на радыё і тэлебачанні” і “Экраннае прачытанне твораў У.С. Караткевіча” – алфавітна-храналагічны.

Дапаможнік суправаджаецца імянным паказальнікам.

Пры складанні выдання выкарыстаны : “Летапіс друку БССР”, “Кніжны летапіс”, “Летапіс газетных артыкулаў”, “Летапіс часопісных артыкулаў”, бібліяграфічныя дапаможнікі “Новая літаратура па культуры і мастацтву” і “Беларуская мова, літаратура, мастацтва”, каталогі і картатэкі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна.

Матэрыялы, пазначаныя зоркай (*), адсутнічаюць у фондах Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна.

Бібліяграфічныя запісы, уключаныя ў дапаможнік, складзены адпаведна ДАСТа 7.1-2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення».

Анатаваны біябібліяграфічны паказальнік можа быць рэкамендаваны студэнтам, выкладчыкам-філолагам, мастацтвазнаўцам, супрацоўнікам бібліятэк і ўсім тым, хто неабыякавы да жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры.

# РЫЦАР СОНЕЧНАЙ СТЫХІІ

Ён прыйшоў да нас пад шэпт “Сівой легенды”, абудзіў усіх “Званамі Віцебска”, пазнаёміў з “Маці ўрагану”, “Кастусём Каліноўскім” і “Цыганскім каралём”, хітравата запытаў: ці ведаем мы, чаму “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, расказаў, як “У снягах драмае вясна”, пагушкаў у “Калысцы чатырох чараўніц”, а пасля запрасіў у “Чорны замак Альшанскі”, навучыў, абмінаючы “Ладдзю Роспачы”, уцякаць ад “Дзікага палявання караля Стаха”, нагадаў, што “Нельга забыць” ні “Маю Іліяду”, ні “Вячэрнія ветразі”, захапляльна распавёў пра “Зямлю пад белымі крыламі”, раскрыў перад намі “Матчыну душу” і цвёрда заявіў – “Быў. Ёсць. Буду”. На шчасце, не памыліўся.

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне ХХ стагоддзя і зведаў на ўласным лёсе ўсе асаблівасці той гістарычнай эпохі. На пачатку ХХІ стагоддзя яго заслужана называюць знакавым беларускім мастаком, “улюбёным” пісьменнікам шматлікіх чытачоў зямлі, якая мроілася яму “пад белымі крыламі”. Больш за 20 гадоў яго няма з намі. Вырасла маладое пакаленне, для якога Караткевіч ужо – класік, хрэстаматыйны аўтар. Але многія са старэйшых яшчэ могуць сёння згадаць пра незабыўныя сустрэчы з Уладзімірам Сямёнавічам, пра ўплыў яго слова, яго светапогляду на развіццё літаратурнай думкі, увогуле – культурніцкага працэсу ў Беларусі.

Нарадзіўся У. Караткевіч 26 лістапада – у дзень смерці вялікага сына зямлі беларускай Адама Міцкевіча, уплыў асобы і творчасці якога Уладзімір Сямёнавіч адчуваў усё сваё жыццё. А памёр 25 ліпеня – у дзень нараджэння сваёй маці Надзеі Васільеўны, якую абагаўляў і любоў і пяшчоту да якой пранёс у сваім сэрцы да канца свайго жыццёвага шляху. Зусім мала адмерыў лёс славутаму земляку – усяго 53 гады. Але нястомны руплівца паспеў пакінуць нашчадкам найвыдатнейшую літаратурную спадчыну, якой сёння ганарыцца і беларуская, і сусветная літаратура: раманы, аповесці і апавяданні, п’есы, нарысы, найцікавейшая публіцыстыка і эсэістыка, сцэнарыі кінафільмаў і тэлевізійных праграм.

Жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча – сапраўдны ўзор незвычайнай самаадданай любові да радзімы, заснаванай на высокай чалавечнасці, на канцэпцыі Чалавека ў нашым сённяшнім разуменні, на сучасным падыходзе да гісторыі Беларусі, гісторыі барацьбы яе народа за свабоду і незалежнасць. Сваёй палымянай творчасцю, яе ідэйным зместам, жанравым багаццем і высокімі эстэтычнымі вартасцямі У. Караткевіч працягваў і пашыраў традыцыі і славу беларускай літаратуры, што ішлі ад Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа…

Па словах Анатоля Бутэвіча, “кожны народ мае ў сваёй гісторыі такіх дзеячаў, у асобе і творчасці якіх найбольш поўна ўвасоблены характар і адметнасць яго самога. Беларусы не выключэнне. Хіба што прызнанне да такіх сыноў Бацькаўшчыны прыходзіць часам са спазненнем… Пераадольваючы пэўнае неразуменне, пакідаючы безуважнымі прыдзіркі асабліва пільных чытальнікаў сваіх твораў, Караткевіч здолеў дайсці да душы прагматычна абачлівага беларуса. Ён абудзіў у ёй тое поклічнае рэха, якое ўжо ніколі, відаць, не заглухне, не адпусціць ад напісанага Уладзімірам Сямёнавічам…”. Ён вельмі любіў Беларусь. І Беларусь таксама любіла Яго: з такім захапленнем і дасведчанасцю пра яе ў той час мала хто гаварыў. Яшчэ ў 50-я гады мінулага стагоддзя “можна было дзівіцца шырыні Валодзевых інтарэсаў, глыбіні яго ведаў па гісторыі, літаратуры, астраноміі” (Г. Бураўкін). Пісьменнік дбаў пра тое, каб не было белых плямаў у нашай памяці і свядомасці. Прырода надзяліла У. Караткевіча зайздроснай памяццю, знітаванай з магутным інтэлектам. Ён памятаў так многа – быццам за ўсіх беспамятных – і ведаў болей за ўсіх, а калі нехта звяртаўся да яго па даведку, ён адразу знаходзіў адпаведную кніжку ці спасылку, або раіў, у каго атрымаць кансультацыю, мог і сярод ночы тэлефанаваць сябру – удакладніць. Усё ўбачанае і пачутае

занатоўвалася ім у запісных кніжках дробным акуратным почыркам. Парадак нататкаў – скрупулёзны. Гэтак жа каліграфічна працавала яго памяць, убіраючы змест старажытных манускрыптаў і першадрукаў, звесткі з розных галін культуры і навук. Насычанасць ведамі, багатая здольнасць да асацыяцый, вірлівая фантазія, чуласць і пранікнёнасць дапамагалі яму глыбока асэнсоўваць мінулае і сучаснае Краіны Беларусь. Прычым, ведамі Уладзімір Сямёнавіч не ганарыўся, а з адкрытай радасцю дзяліўся. Ён атрымаў добрую школу ў Кіеўскім універсітэце, яшчэ большую – самавукам, а гартаваўся ў пошасцях літаратурнай крытыкі часоў застою. І як ні марудна прарастала афіцыйнае прызнанне яго пісьменніцкага таленту, ён ніколі не стамляўся дабрынёю і прагаю пазнання Бацькаўшчыны.

“Караткевіч вельмі любіў людзей, і людзі гэтаксама любілі Яго. Бо ён паважаў іх і прымаў усіх такімі, якія яны ёсць, - з іхнімі хібамі і заганамі, з іхнімі клопатамі і замілаваннямі… Яшчэ пры жыцці У. Караткевіч ужо быў класікам. Многія гэта бачылі, аднак усе неяк саромеліся сказаць яму пра тое… Ён не быў народным па званні, але быў сапраўды народным па прызванні і па той папулярнасці, якую меў сярод народа…” (Я. Сіпакоў).

Уладзімір Караткевіч быў вельмі самабытным чалавекам, арыгіналам, ні на кога не падобным ні знешне, ні па сутнасці. У савецкія часы ён быў сімвалам чалавечнай, творчай і ўвогуле мастацкай свабоды, увасабляў сабой натуральную, арганічную цягу беларускай культуры да еўрапейскіх, сусветных мастацкіх плыняў і тэндэнцый. Па словах Валянціны Коўтун, Караткевіч “займаў адметнае месца ў Святой кнізе беларускай нацыянальнай класікі. Яго шлях – праз церніі – да зорак. Ён – лідэр нацыянальнага падзвіжніцтва… Уладзімір Караткевіч – беларускі літаратурны касмалогас”.

У чым феномен творчасці нашага славутага земляка, ураджэнца Оршы? Уладзімір Караткевіч – заснавальнік беларускага гістарычнага рамана. Менавіта Караткевіч упершыню аздобіў беларускую літаратуру дэтэктыўным жанрам. Нясканчаны раман пра падзеі 1863 года на Беларусі “Каласы пад сярпом тваім”, гістарыясофскі раман “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” – гэта зусім новы для айчыннай літаратуры стыль мыслення, стыль выкладання, стыль пісьма… Зусім новыя і разнастайныя сюжэтныя ходы, новая гістарычная канцэпцыя, новы мастацкі рытм… Праўда і ілюзія. Упершыню ў мастацкі ўжытак шырока ўведзеныя матэрыялы хронік і летапісаў, парафразы біблейскіх тэкстаў, варыяцыі ў розных кантэкстах біблейскіх выразаў і народных выслоўяў. А “Сівая легенда”, “Цыганскі кароль”, “Паром на бурнай рацэ”… Можна доўга пералічаць. Глыбокае, дасканалае веданне фактаў, падзей, рэалій часу. Веданне мастацтва, этнаграфіі, архітэктуры, фальклору, літаратуры. Сусветных і беларускіх. Віртуознае валоданне сюжэтам, фабулай. І – мастацкая “рэканструкцыя” часу, сацыяльнага і побытавага каларыту, псіхалогіі людзей, самасвядомасці. Жывы подых часоў, водар жыцця. Тое, што даецца творчай інтуіцыяй, мастакоўскімі зрокам, слыхам, усімі чуццямі, культурай ведаў – і геннай памяццю, геннай культурай, генезісам маральнага “Я”. Тым, што не сёння з’явілася, мела гістарычны шлях, перадавалася гадамі, стагоддзямі, у пэўных свядомасных, сітуацыйных, падзейных, сацыяльных умовах.

Як вядома, У. Караткевіч меў дваранскія карані і ганарыўся гэтым - у тую пару, калі ніхто яшчэ сутаргава не шукаў у сабе якой кропелькі блакітнай крыві, а, наадварот, - большасць імкнулася падкрэсліць свой рабоча-сялянскі патолены статус. “Уладзімір Караткевіч – чалавечая планета. Яна – прыцягальная і таямнічая, далёкая і блізкая, вядомая і нязведаная. Яе хочацца спасцігнуць розумам, да яе цягнецца душа. На Караткевічавай планеце – утульна ва ўсе часы, ва ўсе поры года. На ёй знаходзяць уцеху людзі розных узростаў, густаў. Тут можна адшукаць адказы на тыя пытанні, перад якімі бяссільныя акадэмічныя падручнікі, вопытныя настаўнікі…” (У. Ліпскі). Па словах Рыгора Барадуліна, “Валодзя ўваходзіў у кожную хату – як свята, як багатая Каляда, як Вялікадне. А наогул ён заўсёды ўяўляўся мне навальнічнай хмарай,

якая, цяжарная вобразамі і залатымі ліўнямі, ападае на паперу: вершамі, апавяданнямі, аповесцямі. Гэта фігура будучыні… Ён не трыбун, але, у начной цішыні пішучы свае творы, заклікаў больш гучна, чым любыя прамоўцы. Ён крычаў душой…". "Усё жыццё Караткевіч займаўся духоўнай рэстаўрацыяй гісторыі свайго народа, як мінулай, так і той, што пісалася тут і зараз" (Ю. Цвяткоў).

Са старонак твораў Караткевіча гаворыць сама Беларусь. І ён гаворыць вуснамі сваіх герояў, іх думамі і ўчынкамі. Калі скласці партрэт Караткевіча, ён убярэ ў сябе характары Алеся Загорскага, Андрэя Грынкевіча, Юрася Братчыка. Урэшце, у кожным з іх – яго часцінка. А яшчэ ва ўсёй веліччы паўстае духоўны воблік Караткевіча са старонак кніг яго паэзіі. "Паэзія Караткевіча заўжды – ад першага радка да апошняга – гучала тастаментна", - адзначаў Васіль Зуёнак. – "Ён быў дакладны і строгі, - як у змесце, так і ў форме ніякага фармальнага штукарства, ніякіх бразготак і танных упрыгожанняў – верш класічна стройны, з каранямі ў глебе, з кронаю – пад аблокі".

Па сваёй натуры Уладзімір Сямёнавіч быў вялікім жыццялюбам. Да яго цягнуліся людзі, асабліва моладзь. Для яго было надта важным захаваць пачуццё ўласнай годнасці, унутраную раўнавагу і ўпэўненасць. "У Караткевічу дзіўным чынам ужываліся ўзнёслы да наіўнасці рамантызм з бязлітасным рэалізмам", - успамінаў Алесь Асіпенка. – "Ён глядзеў на свет як бы праз дзве прызмы: адна прыводзіла яго да экстазу перад прыгажосцю і буйнасцю жыцця, другая – да роспачы перад пачварнай несправядлівасцю і гвалтам. Іншы на яго месцы раздвоіўся б, згубіў бы арыенціры ды і пайшоў па жыцці і літаратуры, як усе, - па праспекце. Караткевіч застаўся верны сабе і сваім прыхільнасцям. У яго быў добры дарадца – мудрасць".

Словамі свайго героя Антона Косміча пісьменнік так сказаў сам пра сябе: "Я адрабіў спаўна і па сваёй ахвоце сваю катаргу на зямлі. Я зрабіў нават болей таго, што мог. І не для сябе, а дзеля іх, дзеля гэтага акіяна, народа майго…". Цяжкасці, перашкоды… Усё гэта ды падобнае трэба было пераносіць чуламу сэрцу, вострай сумленнасці, абражанай годнасці чалавека і мастака.

Кніг У. Караткевіча ў кнігарнях і цяпер няма. Не залежваюцца. Людзі чытаюць яго і ідуць да яго. Да таго каменя з коласам, дзе знайшоў ён вечны свой спачын… Каб ушанаваць памяць і выявіць сваю ўдзячнасць і любоў. Бо ён – "быў, ёсць, будзе".

Людзі адыходзяць у нябыт. Песні не паміраюць. Сыходзяць долу паэты… Жывуць іх вершы. Так і Уладзімір Караткевіч жыве ў сваіх творах і ў творах, прысвечаных яму мастакамі, кампазітарамі, паэтамі, кінарэжысёрамі… Творчасць Караткевіча знайшла адлюстраванне ў тэатральных пастаноўках, кінафільмах, радыёпраграмах. Пранізлівыя вочы пісьменніка пазіраюць на нас з жывапісных палотнаў, якія належаць пэндзлю беларускіх мастакоў. У Інтэрнет-прасторы таксама існуе сайт, прысвечаны геніяльнаму і непаўторнаму пісьменніку. А паэтычныя радкі беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя асобе Караткевіча, гучаць як гімн Няскоранаму Рыцару Духу.

*НАТАЛЛЯ ФЕНЧАНКА, загадчыца аддзела*
*беларускай літаратуры Віцебскай абласной бібліятэкі*
*імя У.І. Леніна*

## У.С. КАРАТКЕВІЧ І СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

1. **Агібалава, А.** Шчастліваму і чорт дзяцей калыша / А. Агібалава // Чырвоная змена. – 1993. – 18 лістап.*

*Пра дзіцячую кніжку-казку“Чортаў скарб” паводле твора У.С. Караткевіча.*

2. **Караткевіч У.С.** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2002. - Т. 1 : “А досвіткі…” – Кучынская. – С. 494-495.

3. **Панізнік, С.** Спагадлівы і чуйны : Уладзімір Караткевіч у дыфузіі нацыянальных культур / С. Панізнік // Голас Радзімы. – 2005. – 10 лістап. (№44/45). – С. 14.

4. **Русецкі, А.** Уладзімір Караткевіч і сучасная беларуская мастацкая культура / А. Русецкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. - № 4. – С. 52-54.

5. **Русецкі, А.** Уладзімір Караткевіч і сучасная беларуская мастацкая культура / А. Русецкі // Веснік ВДУ. – 1997. - № 4. – С. 51-59.

6. **Русецкі, А.** Уладзімір Караткевіч і сучасная беларуская мастацкая культура / А. Русецкі // Лёсы. Людзі. Літаратура / А.У. Русецкі. – Віцебск, 2008. – С. 160-171.

## УРАЧЫСТАСЦІ Ў ГОНАР ПІСЬМЕННІКА

7. **Акулін, І.** Віно дажджоў… / І. Акулін // Літаратура і мастацтва. – 2002. – 5 крас. (№ 14). – С. 10.

*Пра вечарыну “Віно дажджоў”, прысвечаную памяці У.С. Караткевіча (1930-1984), якая адбылася ў касцеле св. Сымона і Алены.*

8. **Васілеўскі, П.** Бел-чырвона-белыя кветкі Уладзіміру Караткевічу ад сацыял-дэмакратаў / П. Васілеўскі // Народная воля. – 2005. – 1 снеж.*

*Аб святочных мерапрыемствах у Оршы.*

9. **Вишня, О.** Короткевичу – от земляков / О. Вишня // Семь дней. – 2002. – 7 дек. (№ 49). – С. 15.

*О проведении мероприятия, посвященного дню рождения В.С. Короткевича, в Орше.*

10. **Гук, С.** Памяці Уладзіміра Караткевіча / С. Гук // Народнае слова. – 2000. – 28 лістап. – С. 1.

*Урачыстасці да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка, г. Віцебск.*

11. **Дуброўскі, Ф.** Праўдзівы майстра, чысты, як сляза… / Ф. Дуброўскі // Віцьбічы. – 2005. – 29 лістап. – С. 1, 7.

*Святкаванне 75-годдзя з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

12. **Ждановіч, І.** Вяртанне ў горад каштанаў / І. Ждановіч // Голас Радзімы. – 2009. – 12 лістап. (№ 43).*

*У Кіеве адкрыўся Цэнтр беларускай мовы і культуры, а таксама плануецца ўзвесці помнік У.С. Караткевічу.*

13. **Іваноўскі, Ю.** Слава цябе даганяе… / Ю. Іваноўскі, Г. Каралёў // Віцебскі рабочы. – 2000. – 28 лістап. – С. 1.

*Пра ўрачысты сход у тэатры імя Я. Коласа, прысвечаны У.С. Караткевічу.*

14. **Конахава, Н.** Быў, Ёсць, Буду / Н. Конахава // Віцьбічы. – 2000. – 11 чэрв. – С. 3.

*Святкаванне 70-х ўгодкаў з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

15. **Конахава, Н.** Яго называюць дыяментам / Н. Конахава // Вечерний Витебск. – 2000. – 25 нояб. – С. 2.

*Дні літаратуры і мастацтва ў гонар 70-годдзя з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

16. **Лабадзенка, Г.** Орша і Рагачоў памятаюць Караткевіча па-рознаму / Г. Лабадзенка // Звязда. – 2009. – 31 кастр. – С. 3.

*У Оршы – музей, вуліца і помнік, у Рагачове – занядбаная магіла бабулі і недасяжны пакой пісьменніка.*

17. **Лободенко, Г.** В музее Короткевича / Г. Лободенко // Вечерний Минск. – 2002. – 2 дек. – С. 3.*

*О вечере памяти В.С. Короткевича в музее писателя в Минском профессионально-техническом колледже электроники.*

18. **Мурашкіна, В.** А палове першай ля помніка Уладзіміру Караткевічу / В. Мурашкіна // Народнае слова. – 2000. – 11 ліп. – С. 2.

*Тэатралізаваная дзея памяці пісьменніка.*

19. **Нікіціна, В.** Памяці Уладзіміра Караткевіча / В. Нікіціна // Народнае слова. – 2000. – 28 лістап. – С. 1.

*Урачыстасці да 70-годдзя з дня нараджэння пісьменніка ў Оршы.*

20. **Пятрушын, В.** Тут стаў я сынам краіны… / В. Пятрушын // Витебский курьер. – 2000. – 28 нояб. – С. 3.

*Святочныя мерапрыемствы ў Оршы, прысвечаныя 70-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

21. **Радомская, Л.** Дзень Караткевіча на "Славянскім базары" / Л. Радомская // Аршанская газета. – 2000. – 13 ліп. – С. 1.*

22. **Соловьева, Т.** К юбилею Владимира Короткевича / Т. Соловьева // Витебский курьер. – 2000. – 28 нояб. – С. 3.

*Мероприятия, посвященные 70-летию со дня рождения В.С. Короткевича.*

23. **Шпакоўская, Г.** Радня паэта – чытачы / Г. Шпакоўская // Народнае слова. – 1995. – 28 лістап. – С. 1.

*Дні літаратуры і мастацтва ў Оршы з нагоды 65-годдзя з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

24. **Шпакоўская, Г.** Уладзіміру Караткевічу прысвячаецца / Г. Шпакоўская // Народнае слова. – 1998. – 28 лістап. – С. 2.

*Пра Дні літаратуры, прысвечаныя драматургу У. Караткевічу (1930-1984), у г. Віцебску і Оршы.*

25. **Шутава, В.** Аршанскія ўрачыстыя дні ў гонар славутага земляка У. Караткевіча / В. Шутава // Народнае слова. – 2005. – 29 лістап. – С. 5.

## ВОБРАЗ У. КАРАТКЕВІЧА Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ

26. **Асіповіч, А.** Каласы ўдзячнасці – майстру / А. Асіповіч // Звязда. – 1992. – 7 ліп. – С. 3.

*Пра адкрыццё помніка У.С. Караткевічу ў Оршы.*

27. **Базылевіч, М.** "Зямля пад белымі крыламі" / М. Базылевіч // Голас Радзімы. – 2006. – 12 студз. (№ 1-2). – С. 9.

*Аб выставе Беларускага саюза мастакоў у галерэі Аршанскага музея Уладзіміра Караткевіча, прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння пісьменніка.*

28. **Барабаншчыкава, В.** “Але каханне не памірае…” / В. Барабаншчыкава // Настаўніцкая газета. – 2006. – 11 лют. – С. 7.

*Выстава Беларускага саюза мастакоў “Зямля пад белымі крыламі”, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

29. **Будавей, М.** Уладзімір Караткевіч / М. Будавей // Мастацтва. – 2000. - № 10. – С. 16. - Змеш. тэхніка : афсет ; 12х8 см.

30. **Будавей, М.** Уладзімір Караткевіч / М. Будавей // Мастацтва Беларусі. – 1987. - № 2. – С. 67. - Змеш. тэхніка : афсет ; 12х8 см.

31. **Варвашэня, А.** “Маршрут па азімуце” Караткевіча / А. Варвашэня, К. Селіханаў ; гутарыў Б. Крэпак // Культура. – 2010. – 13-19 сак. (№ 11). – С. 13.

*Гутарка з пераможцамі Рэспубліканскага конкурсу эскізных праектаў помніка беларускаму пісьменніку ў Кіеве скульптарамі Алегам Варвашэнем і Канстанцінам Селіханавым.*

32. **Верабей, А.** Талент пісьменніка-мастака / А. Верабей // Роднае слова. – 2007. - № 8. – С. 60-61. – Рэц. на кн.: Свет вачыма Караткевіча (малюнкі, аўтапартрэты, карыкатуры, шаржы) : навук.-папуляр. выданне / уклад. В. Сіднякова [і інш.]. – Орша, 2006. – 116 с.

33. **Вишневский, В.** Посвящение Владимиру Короткевичу / В. Вишневский // Неман. – 2000. - № 1. – На обл. : цв. офсет. ; 13х10 см.

34. **Горевой, М.** Пленэр памяти Владимира Короткевича в Орше / М. Горевой // Витебский курьер. – 2000. – 29 сент. – С. 4.

35. **Дзедзінец, А.** Ад пленэра да галерэі / А. Дзедзінец // Віцебскі рабочы. – 2000. – 28 кастр. – С. 1.

*Пра пленэр у Оршы, прысвечаны У.С. Караткевічу.*

36. **Дубовік, С.** У гонар Караткевічу / С. Дубовік // Літаратура і мастацтва. – 2006. – 3 сак. (№ 9). – С. 3.

*Пра выставу”Зямля пад белымі крыламі” твораў жывапісу, прысвечаных нашаму земляку ўПалацы мастацтва ў Мінску.*

37. **Жук, Т.** Сыну “Зямлі пад белымі крыламі” прысвячаецца… / Т. Жук // Веды. – 2000. – 30 лістап. (№ 13). – С. 7.

*Аб выставе, прысвечанай творчасці У.С. Караткевіча, у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі.*

38. **Зінкевіч, У.** Караткевіч / У. Зінкевіч // Маладосць. – 1983. - № 11. – На ўкл. : алей, аўтатып. каляр. ; 18х14 см.

39. **Зінкевіч, У.** Партрэт Уладзіміра Караткевіча / У. Зінкевіч // Беларусь. – 1986. - № 7. – На ўкл. : цынкагр. каляр. ; 15х11 см.

40. **Ксяндзоў, А.** Сакавіцкі апошні снег. Памяці У. Караткевіча / А. Ксяндзоў // Беларусь. –1989. - № 10. – На ўкл. : цынкагр. каляр. ; 8х9 см.

41. **Кузьміч, Т.** “Ён гэтак многа ведае, каб жыць…” / Т. Кузьміч // Віцебскі рабочы. – 1994. – 29 ліп. – С. 1.

*Пра адкрыццё помніка У.С. Караткевічу ў г. Віцебску.*

42. **Куклов, В.** Миротворцы с мольбертами / В. Куклов // Белорусская деловая газета. – 2001. – 9 авг. – С. 13.

*Юные художники из шести стран приняли участие в VII Международном детском пленере, посвященном В.С. Короткевичу.*

43. **Купава, М.** Дотык да вечнасьці? : альбо Яшчэ колькі словаў пра выставу "Зямля пад белымі крыламі", прысвечаную юбілею У.С. Караткевіча (1 лютага 2006, Мінск) / М. Купава // Дзеяслоў. – 2006. – № 6. – С. 300-306.

44. **Купава, М.** Зямля пад белымі крыламі / М. Купава // Мастацтва. - 2006. - № 9. – С. 26.

*Аб аднайменнай выставе Беларускага саюза мастакоў, прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння пісьменніка У.С. Караткевіча, у Оршы.*

45. **Кучар, З.** Ён аддаў Радзіме сэрца і сілы / З. Кучар // Голас Радзімы. – 1996. – 1 лют. (№ 5). – С. 7.

*Пра выставу "Быў. Ёсць. Буду", прысвечаную 65-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.*

46. **Лісіца, І.** Ілюстрацыя да аповесці У. Караткевіча "Сівая легенда"/ І. Лісіца // Маладосць. – 1980. - № 10. – На вокл. : каляр. літагр., цынкагр.

47. **Мемус, А.** Наш Караткевіч : [трыпціх] / А. Мемус. - Кардон, алей ; 30х60 см. (бакавая частка), 60х55 (цэнтр. частка).

48. **Мікіта, В.** Па матывах зборніка вершаў У. Караткевіча "Мая Іліяда" / В. Мікіта // Маладосць. – 1987. - № 1. – На ўкл. : каляр. аўталітагр., цынкагр. каляр. ; 13х18 см.

49. **Наш боль,** смутак і гонар : [помнік У.С. Караткевічу] // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 5 жніўн. (№ 32). – С. 2, 3.

50. **Нікіціна, В.** Сцяжынкамі Караткевіча / В. Нікіціна // Народнае слова. - 2000. – 30 верас. – С. 5.

*Рэспубліканскі пленэр, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча, адбыўся ў Оршы.*

51. **Палякова, І.** Выстава адной карціны / І. Палякова // Аршанская газета. – 2002. – 26 лістап. – С. 1.

*Трыпціх віцебскага мастака Алеся Мемуса "Наш Караткевіч".*

52. **Помнік** Уладзіміру Караткевічу ў Оршы : (скульптар Ігар Голубеў) // Маладосць. – 1994. - № 12. – С. 200.

53. **Райчонак, А.** Літаратурна-мастацкі пленэр, прысвечаны Уладзіміру Караткевічу на Аршаншчыне / А. Райчонак // Наша слова. – 2005. – 3 жніўн. (№ 29).*

54. **Рублеўскі, С.** Быў! Ёсць! Будзе! / С. Рублеўскі ; фота М. Шмерлінга // Народнае слова. – 1994. – 26 ліп. – С. 1.

*Аб адкрыцці помніка У.С. Караткевічу ў Віцебску 24 ліпеня 1994 г., (скульптар Іван Казак, архітэктар Валерый Рыбакоў).*

55. **Танчэўская, А.** Ля Дняпра, дзе нарадзіўся паэт / А. Танчэўская // Аршанская газета. – 1997. – 29 лістап. – С. 1.

*Прыхільнікі творчаці У.С. Караткевіча ля яго помніка ў Прыдняпроўскім парку.*

56. **Тоўсцік, У.** Свет Уладзіміра Караткевіча / У. Тоўсцік // Мастацтва. – 2009. - № 2. – С. 6.

*Манументальнае пано для адноўленага будынка езуіцкага калегіума ў Оршы 2008 г.*

57. **Уладзімір Караткевіч** : [партрэт] // Партрэты беларускіх пісьменнікаў і паэтаў / маст. К. Ціхановіч [і інш.] ; Беларус. т-ва аматараў кн., Мін. вытвор. прад-ва "Спадчына". – Мн. : Б. в., 1993. – 45 л. у папцы.

58. **Уладзімір Караткевіч** : [партрэт] // Партрэты беларускіх пісьменнікаў : альбом / уклад. Д.А. Бессараб ; маст. А.А. Ерышава. – Мн. : Белорусский верасень, 2005. – 14 л.

59. **Ульяновіч, К.** Быў. Ёсць. Будзе / К. Ульяновіч // Белорусская нива. - 1991. – 26 июня. – С. 4.

*З выставы, прысвечанай 60-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча, Мінск.*

60. **Цыбульскі, М.** "Колер у кожным абрысе…" / М. Цыбульскі // Віцьбічы. – 2005. – 12 ліп. – С. 7.

*Пра мастацкі пленэр на Аршаншчыне, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

61. **Цыбульскі, М.** Уладзімір Караткевіч : "Мой век дваццаты" / М. Цыбульскі // Культура. – 2000. – 16-22 снеж. (№ 50). – С. 8.

*Аб мастацкай экспазіцыі, прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння У.С. Караткевіча.*

62. **Чабатарова, Т.** Пленэр у гонар Караткевіча : Аршанскі раён / Т. Чабатарова // Витебский курьер. – 2005. – 5 июля. – С. 1.

63. **Янушкевіч, Ф.** Партрэт Уладзіміра Караткевіча : [палатно] / Ф. Янушкевіч // Роднае слова. – 1993. - № 12. - С. 37. - Алей, афсет. ; 5х5 см.

64. **Янушкевіч, Ф.** Уладзімір Караткевіч і хрыстапрадаўцы / Ф. Янушкевіч // Роднае слова. – 1993. - № 12. – На ўкл. : цынкагр. каляр. ; 13х10 см.

## МУЗЫЧНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ТВОРАЎ У. КАРАТКЕВІЧА

65. **Алейнікава, Э.** "Былі. Ёсць. Будзем…" / Э. Алейнікава // Беларусь. – 1990. - № 11. – С. 19.

*Пра оперу У. Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха" паводле аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча.*

66. **Караткевіч Уладзімір** : 1930-1984 // Беларуская літаратура ў музыцы (1918-1989) : нота-і фанаграфічны паказальнік / Дзярж. б-ка імя У.І. Леніна Рэспублікі Беларусь, М-ва культуры ; склад. Г.А. Быстроў, В.М. Карсека ; рэд. В.М. Карсека. – Мн., 1991. – С. 154-155.

*Песні на вершы У. Караткевіча.*

67. **Быў. Ёсць. Буду**… / падрыхт. Н. Пшанічная // Минская школа. – 2003. – № 7. – С. 35-41.

*Літаратурна-музычны спектакль па творчасці У.С. Караткевіча.*

68. **Галушко, М.** Национальный сюжет – современное прочтение / М. Галушко // Современная музыка. – 1990. - № 4. – С. 43-47.

*Пра оперу У. Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха".*

69. **Верабей, А.** Словы да паланеза : знойдзены два вершы У. Караткевіча да знакамітага твора М.К. Агінскага / А. Верабей // Голас Радзімы. – 2009. – 17 верас. (№ 35).*

70. **Давідовіч, У.** Памяці Уладзіміра Караткевіча : "Подзвіг ранішні твой…" / У. Давідовіч ; сл. Р. Барадуліна // Мастацтва. – 1992. – № 11. – С. 16.

71. **Дзікае** паляванне караля Стаха // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2002. – Т. 1 : "А досвіткі…" – Кучынская. - С. 343.

72. **Жураўлёў, Д.** Неўміручасць легенды / Д. Жураўлёў // Звязда. – 1978. - 1 чэрв. – С. 4.

*Опера Д. Смольскага на лібрэта У. Караткевіча "Сівая легенда" ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета БССР.*

73. **Златковская, Н.** "…Безмолвные всадники, туманные кони…" / Н. Златковская // Салон. – 1991. - № 5. – С. 20.*

*Об опере В. Солтана "Дикая охота короля Стаха" по одноименной повести В. Короткевича в Государственном академическом Большом театре оперы и балета БССР.*

74. **Зубрыч, І.** Каб не зачарсцвець душой… / І. Зубрыч // Літаратура і мастацтва. – 1987. - 13 лют. (№ 7). – С. 10.

*Фільм-опера "Сівая легенда" Беларускай студыі тэлебачання паводле аднайменнай оперы Дз. Смольскага і аповесці У. Караткевіча.*

75. **Караев, Ю.А.** Роль хоровых сцен в опере "Седая легенда " Д. Смольского / Ю.А. Караев // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мн., 2006. – Вып. 6. – С. 152-159.

76. **Караткевіч, У.С.** Быў. Ёсць. Буду! : [гуказапіс] : рамансы, песні, вершы, вальсы / У.С. Караткевіч ; выкон.: У. Караткевіч, голас ; Н. Кавалёва, голас ; Сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам А. Лапунова ; Інструментальны ансамбль ; А. Саўчанка, голас ; Б. Вайханскі, голас ; Г. Вайханская, голас ; А. Камоцкі, голас. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1 гукавы дыск. - 45.25 хв. – Змест: Ой, Косю, мой Косю / словы У. Караткевіча ; Бацькаўшчына / Л. Мурашка ; словы У. Караткевіча ; Каласы пад сярпом тваім : вальс для радыёспектакля / А. Залётнаў ; О, якая туга / словы У. Караткевіча ; О, якое цёплае, цёплае, цёплае мора… / словы У. Караткевіча ; Дзікае паляванне караля Стаха / У. Солтан ; словы У. Караткевіча ; Маўзалей Джаніне – Ханум / словы У. Караткевіча ; Сівая легенда / Д. Смольскі ; словы У. Караткевіча ; Песня Мехмета / словы У. Караткевіча ; Фантан слёз / словы У. Караткевіча ; Мокрыя травы / Б. Вайханскі ; словы У. Караткевіча ; Казкі / Б. Вайханскі ; словы У. Караткевіча ; Роздум / А. Камоцкі ; словы У. Караткевіча ; О, каханне маё бясконцае… / А. Камоцкі ; словы У. Караткевіча ; Як сканаю – душа застанецца… / А. Камоцкі ; словы У. Караткевіча.

77. **Кліменценка, С.** Уладзімір Караткевіч : і ў песні быў, ёсць, будзе! / С. Кліменценка // Народная воля. – 2003. – 18 снеж. – С. 4.

*Аб канцэртнай праграме аркестра М. Фінберга "Новыя песні" з цыкла "Славутыя імёны Беларусі", прысвечанай У. Караткевічу.*

78. **Коробков, С.** Дикая охота над Белой Русью / С. Коротков // Музыкальная жизнь. – 1990. - № 11. – С. 6-7.

*Про оперу В. Солтана "Дикая охота короля Стаха".*

79. **Кузняцова, Н.** Святло і боль Уладзіміра Караткевіча / Н. Кузняцова // Звязда. – 1989. – 5 крас. – С. 3.

*Опера У.Я. Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха" ў Беларускім тэатры оперы і балета.*

80. **Куляшова, Г.** Да глыбінь чалавечай душы / Г. Куляшова // Звязда. – 1989. – 26 мая. – С. 4.

*"Дзікае паляванне караля Стаха" на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета БССР.*

81. **Лабанава, С.** Опера "Дзікае паляванне караля Стаха" / С. Лабанава // Роднае слова. – 1999. - № 2. – С. 159-163.

*Пра сцэнарны план оперы, музычную драматургію кампазітара У.Я. Солтана.*

82. **Лучина, В.** Экранное и музыкально-сценическое воплощение повести В. Короткевича «Дикая охота короля Стаха» / В. Лучина // На шляху да сталасці. - Мн., 2001. - С. 298-307.*

83. **Ляонава, Л.** Цені далёкіх продкаў / Л. Ляонава // Голас Радзімы. – 1990. – 5 ліп. (№ 27). – С. 7.

*Опера "Дзікае паляванне караля Стаха" кампазітара У.Я. Солтана паводле аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР.*

84. **Мурашка, Л.** Бацькаўшчына : "Дагарэў за брамай небакрай…" / Л. Мурашка ; словы У. Караткевіча // Сто песень беларускіх кампазітараў / уклад. А.М. Чыркун. – Мн. : Беларусь, 2002. – С. 126-127.

85. **Мурашка, Л.** Бацькаўшчына : "Дагарэў за брамай небакрай…" / Л. Мурашка ; верш У. Караткевіча // Роднае слова. – 2003. - № 10. – С. 111.

86. **Мурашка, Л.** Бацькаўшчына : "Дагарэў за брамай небакрай…" / Л. Мурашка ; верш У. Караткевіча ; уступ. арт. М. Шавыркіна // Звязда. – 2001. – 19 мая. – С. 8.

87. **Мушынская, Т.** "А крыніца песняю льецца…", або Словам Караткевіча натхнёныя / Т. Мушынская // Мастацтва. – 2004. - № 3. – С. 24-25.

*Музычная праграма Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі, прысвечаная паэзіі У.С. Караткевіча, увасобленай у песнях.*

88. **Мяльгуй, А.** "Паляванне…" у Вялікім / А. Мяльгуй // Чырвоная змена. – 1989. – 29 ліп. – С. 9.

*Опера У. Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха" ў Беларускім тэатры оперы і балета.*

89. **Offline Опернае** мастацтва // Музычны тэатр Беларусі (1960-1990) : опернае мастацтва : музычная камедыя і аперэта : падручнік для навуч. устаноў культуры і мастацтва / Г.Р. Куляшова, Т.Г. Мдывані, Н.А. Юўчанка. – Мн. : Беларуская навука, 1966. – С. 7-332.

90. **Палупанаў, У.** Беларусь, маё сонца : [песня] / У. Палупанаў ; словы У. Караткевіча // Роднае слова. – 1995. - № 4. – С. 180-181.

91. **Сівая** легенда // Музычны тэатр Беларусі (1960-1990) : опернае мастацтва : музычная камедыя і аперэта : падручнік для навуч. устаноў культуры і мастацтва / Г.Р. Куляшова, Т.Г. Мдывані, Н.А. Юўчанка. – Мн. : Беларуская навука, 1966. – С. 176-196.

92. **Сівая** легенда // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2003. - Т. 2 : Лабанок– Яшчур. - С. 343.

93. **Сізко, В.** Творчае гарэнне / В. Сізко, У. Солтан // Мастацтва Беларусі. – 1989. - № 11. – С. 60-64.

*Аб оперы "Дзікае паляванне караля Стаха" па аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча.*

94. **Скарабагатаў, В.** "Дзікае паляванне…" на опернай сцене / В. Скарабагатаў, І. Шыкунова // Роднае слова. – 2006. - № 6. – С. 86-89 ; № 11. – С. 74-80.

*Музычнае ўвасабленне У. Солтанам аповесці У.С. Караткевіча.*

95. **Скарабагатаў, В.** Пастаноўка "Сівой легенды" / В. Скарабагатаў, І. Шыкунова // Роднае слова. – 2006. - № 4. – С. 84-87.

*Опера Дз. Смольскага паводле аднайменнага твора У.С. Караткевіча ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета.*

96. **Скарабагатаў, В.** Станаўленне нацыянальнай оперы : Уладзімір Караткевіч – апостал адраджэння найноўшага часу / В. Скарабагатаў, І. Шыкунова // Роднае слова. – 2006. - № 3. – С. 88-90.

97. **Смольскі, Д.** Так ствралася лібрэта… / Д. Смольскі ; успаміны запісаў Віктар Скорабагатаў // Культура. – 2005. – 14-20 мая (№20). - С. 15.

*Гутарка з аўтарам оперы "Сівая легенда" Дзмітрыем Смольскім.*

98. **Сцепанцова, Н.** Гэты недасяжны свет Караткевіча / Н. Сцепанцова // Літаратура і мастацтва. – 1989. – 19 мая. (№ 20). – С. 10-11.

*“Дзікае паляванне караля Стаха” ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета.*

99. **Цвіка, Л.** Вяртанне Караткевіча / Л. Цвіка // Віцебскі рабочы. – 1989. – 18 ліп. – С. 4.

*Гастролі ў Віцебску Беларускага тэатра оперы і балета.*

100. **Чортаў** скарб : пяць мініяцюр для фартэпіяна : паводле казкі Уладзіміра Караткевіча // Каляровыя сны : для фартэпіяна / Л. Мурашка. – Баранавічы : У.А. Грушэўскі, 2008. – 36 с. – Змест : Чароўны край ; Недарэчны Янка ; Чортава балота ; Гарэзлівае чарцяня ; Нечаканы скарб.*

101. **Юўчанка, Н.** Званоў і струн акрыленыя гукі / Н. Юўчанка // Літаратура і мастацтва. – 1977. – 7 студз. (№ 1). – С. 11.

*Нататкі пра музыку ў спектаклях “Званы Віцебска” па п’есе У.С. Караткевіча і “Сымон-музыка” па паэме Я. Коласа Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.*

## СПАДЧЫНА КАРАТКЕВІЧА Ў ФОНДАХ І КАЛЕКЦЫЯХ МУЗЕЯЎ

102. **Аркуш, А.** Музей Караткевіча / А. Аркуш // Наша ніва. – 2000. – 30 кастр. – С. 11.

*Пра адкрыццё ў Оршы музея класіка беларускай літаратуры У.С. Караткевіча да 70-годдзя з дня нараджэння.*

103. **Барысенка, У.** Вяртанне Уладзіміра Караткевіча / У. Барысенка // Рэспубліка. – 2000. – 29 лістап. – С. 2.

*Пра музей У.С. Караткевіча ў Оршы.*

104. **Белавус, І.** Калыскай ягонай быў сівы Дняпро… / І. Белавус // Белорусская нива. – 2000. – 25 нояб. – С. 5.

*Літаратурны музей У.С. Караткевіча ў Оршы.*

105. **Ваўковіч, А.** Караткавечны музей / А. Ваўковіч // Наша свабода. – 2001. – 1 чэрв. - С. 7.

*Інфармацыя аб закрыцці музея У.С. Караткевіча ў Оршы.*

106. **Грэчка, І.** “Белы човен”, плёскат хваляў… / І. Грэчка // Настаўніцкая газета. – 2009. – 14 сак. – С. 12.

*Пра літаратурна-краязнаўчы музей “Слава настаўніку”, які працуе ў аршанскай сярэдняй школе № 3 імя У.С. Караткевіча.*

107. **Закржевский, Г.** Музей Владимира Короткевича / Г. Закржевский // Советская Белоруссия. – 2000. – 3 нояб. – С. 4.

*Об открытии 26 ноября в Орше культурного центра им. В.С. Короткевича к 70-летнему юбилею писателя.*

108. **Ішчанка, С.** Уладзімір Караткевіч на сайце і ў музеі / С. Ішчанка // Культура. – 2004. – 31 студз.–6 лют. (№ 5). – С. 22.

109. **Карлюкевіч, А.** “Тут стаў я сынам краіны…” / А. Карлюкевіч // Чырвоная змена. – 2000. – 15 жніўн. – С. 5.

*Пра ўвекавечанне памяці пісьменніка, драматурга У.С. Караткевіча ў Оршы і адкрыццё музея імя У.С. Караткевіча, прымеркаваныя да яго 70- годдзя.*

110. **Кузубаў, У.** Для вашай і нашай памяці / У. Кузубаў // Віцебскі рабочы. – 2004. – 18 снеж. *

*Аб перспектывах адкрыцця музея У.С. Караткевіча ў Оршы.*

111. **Макарэвіч, С.** Пад знакам Уладзіміра Караткевіча / С. Макарэвіч // Літаратура і мастацтва. – 2009. – 20 лістап. (№ 44). – С. 16.

*Аб наведванні памятных мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка ў Оршы і Рагачове.*

112. **Маршалович, Л.** В гости к писателю / Л. Маршалович // Аршанская газета. – 2009. – 29 студз. – С. 4.

*О музее В.С. Короткевича в Орше.*

113. **Музей** Караткевіча ў Оршы : па матэрыялах “Радыё Рацыя” // Ніва. – 2002. – 10 лют. (№ 6). – С. 2.*

114. **Музей,** які нарадзіўся… у раддоме // Культура. – 2000. – 2-8 снеж. (№ 48). – С. 1, 3.

*Пра адкрыццё першай экспазіцыі Літаратурнага музея У.С. Караткевіча ў Оршы і ўрачыстыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 70-годдзя пісьменніка.*

115. **Орлов, В.** Не по рангу : быть или не быть музею Короткевича? / В. Орлов // Белорусская деловая газета. – 2003. – 13 марта. – С. 14.

116. **Пашковіч, В.** Здабыткі нацыяльнай літаратуры цяпер у гукавым фармаце / В. Пашковіч // Телеком-экспресс. – 2009. – 26 нояб. – С. 10.*

*Аршанскі музей У.С. Караткевіча атрымаў у падарунак аўдыёкнігазбор з выбранымі творамі пісьменніка.*

117. **Пятрушын, В.** Дапамажыце музею У. Караткевіча / В. Пятрушын // Голас Радзімы. – 1997. - 3 крас. (№ 14). – С. 6.

118. **Сіднякова, В.** Музей – даніна таленту земляка-пісьменніка / В. Сіднякова ; гутарку запісала В. Дзегцярова // Аршанская газета. – 2000. – 23 лістап. – С. 1.

*Гутарка з намеснікам старшыні гарвыканкома пра стварэнне ў Оршы музея У.С. Караткевіча.*

119. **Сидорович, О.** Музей Владимира Короткевича : [открытие музея в Орше] / О. Сидорович // Семь дней. – 1996. – 8 июня (№ 23). – С. 10.

120. **Суша, Г.** Быў. Ёсць. Будзе / Г. Суша // Літаратура і мастацтва. – 2005. – 11 лістап. (№ 45). – С. 5.

*Аб экспазіцыі Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны, прысвечанай пісьменніку У.С. Караткевічу.*

121. **Шапран, С.** Не по “рангу” / С. Шапран // Белорусская деловая газета. – 2003. – 13 марта. – С. 14.

*О проблеме создания в Минске квартиры-музея белорусского писателя В.С. Короткевича.*

## ТЭАТРАЛЬНА-СЦЭНІЧНАЕ ЎСПРЫМАННЕ У.С. КАРАТКЕВІЧА

122. **Алісейчык, Г.** На строме адвечнай ракі : “Роспач” паводле У. Караткевіча ў тэатры-студыі “Дзе-Я”, г. Мінск / Г. Алісейчык // Літаратура і мастацтва. – 1989. – 6 кастр. (№ 40). – С. 10-11.

123. **Барабаншчыкава, В.** Размова каласоў / В. Барабаншчыкава // Настаўніцкая газета. – 2008. – 5 крас. – С. 9.

*Прэм’ера спектакля “Каласы пад сярпом тваім” паводле У.С. Караткевіча ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, рэжысер В. Анісенка.*

124. **Бялоў, С.** Па слядах “Дзікага палявання” / С. Бялоў // Гомельские ведомости. – 1999. – 27 мая. – С. 7.*

*Пра спектакль “Дзікае паляванне караля Стаха” па аповесці У.С. Караткевіча ў Гомельскім абласным драматычным тэатры, рэжысёр У. Караткевіч.*

125. **Віктараў, У.** Прэм’ера народнага тэатра / У. Віктараў // Звязда. – 1979. – 29 снеж. – С. 4.

*Спектакль “За шчасце, за волю” па творах Я. Купалы і У. Караткевіча ў пастаноўцы народнага літаратурна-музычнага тэатра Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. Кірава.*

126. **Грамыка, Л.** Дачыненне / Л. Грамыка // Мастацтва. – 2000. - № 9. – С. 14-15.

*Аб спектаклі“Ладдзя роспачы” паводле аповесці У.С. Караткевіча ў Беларускім тэатры “Лялька” г. Віцебска, пастаноўка В. Клімчука.*

127. **Дружкова, А.** Не так страшны чорт… / А. Дружкова // Витебский курьер. – 2004. – 14 дек. – С. 3.

*Спектакль “Забыты скарб” па казцы У.С. Караткевіча “Чортаў скарб” у віцебскім тэатры “Лялька”.*

128. **Дружкова, К.** Верлібр Жыцця і Смерці, або Час збаўляцца ад маскі / К. Дружкава // Віцебскі рабочы. – 2000. – 5 верас. – С. 4.

*Аб спектаклі тэатра “Лялька” г. Віцебска паводле аповесці У.С. Караткевіча “Ладдзя Роспачы”, рэжысёр В. Клімчук.*

129. **Дружкова, К.** Скарбонка душы / К. Дружкова // Мастацтва. – 2005. - № 1. – С. 23.

*“Забыты скарб” паводле У.С. Караткевіча ў Беларускім тэатры “Лялька”, рэжысёр В. Клімчук.*

130. **Дэконская, В.** Яшчэ адна кветка ў вянок класіку / В. Дэконская // Краязнаўчая газета. – 2005. – Кастр. (№ 40). – С. 2.

*Спектакль “Ладдзя Роспачы” па аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.*

131. **Ждановіч, В.** Адрэналін з пяшчотай над безданню дыялектыкі / В. Ждановіч // Беларусь. Belarus. – 2006. - № 3. – С. 40-42.

*Спектакль “Дзікае паляванне караля Стаха” па аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.*

132. **Званы Віцебска** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2002. – Т. 1 : “А досвіткі…” – Кучынская. - С. 437.

133. **Іваноўскі, Ю.** Слава цябе даганяе… / Ю. Іваноўскі, Г. Каралёў // Віцебскі рабочы. – 2000. – 28 лістап. – С. 1.

*Пра ўрачысты сход у тэатры імя Я. Коласа, прысвечаны У.С. Караткевічу.*

134. **Кавалеў, С.** Жабкі і чарапашка : п’еса паводле казкі У. Караткевіча і дзіцячых гульняў / С. Кавалеў // Хохлік : зб. п’ес для драм. і лялечных тэатр. калектываў / С. Кавалеў ; аўт. прадмовы С. Юркевіч ; Бел. дзярж. ін-т праблем культуры. – Мн. : БелДІПК, Мазыр : ТАА “Выд. Дом “Белы вецер”, 2002. – 119 с.*

135. **Кавалеў, С.** Жабкі і чарапашка / С. Кавалеў // Пачатковая школа. – 1993. - № 5. – С. 37-40 ; № 6. – С. 38-40.

*П’еса паводле казкі У.С. Караткевіча і дзіцячых гульняў: для школьнага тэатра.*

136. **Кавалеў, С.** Заяц варыць піва : [п’еса ў 2 дзеях па матывах вершаў і казак У.С. Караткевіча] / С. Кавалеў // Тэатральная Беларусь. – 1994. – № 3. – С. 2-9.

137. **Кавалеў, С.** Заяц варыць піва : [п’еса ў 2 дзеях па матывах вершаў і казак У.С. Караткевіча] / С. Кавалеў // Пачатковая школа. – 1993. – № 7. – С. 60-63 ; № 8. – С. 42-45.

138. **Казлоўскі, І.** Пачатак світання / І. Казлоўскі // Чырвоная змена. – 1998. – 29 чэрв. – С. 8.

*Пра спектакль драматычнага гуртка “Золак” пры Доме культуры бытавога абслугоўвання г. Мінска па твору У.С. Караткевіча “Маці Ўрагану”.*

139. **Каляда, А.** Жыць для людзей : [інсцэніроўка паводле твораў У.С. Караткевіча] / А. Каляда // І засталася каса ў пракосе… : рэпертуар. зб. : для сярэд. і ст. шк. узросту / уклад. Н.С. Загорская ; маст. Б.Г. Лалыка. - Мн. : Юнацтва, 1988.*

140. **Кастусь** Каліноўскі : [пра трагедыю ў 3 актах У.С. Караткевіча] // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2002. – Т. 1 : “А досвіткі…” – Кучынская. - С. 507.

141. **Кастылянчанка, І.А.** Творы У. Караткевіча на беларускай сцэне / І.А. Кастылянчанка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / навук. рэд. А.І. Лакотка ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы, НАН Беларусі. – Мн. : Права і эканоміка, 2009. – Вып. 6. – С. 166-175.

142. **Катавіцкі, В.** “Што яны ведаюць аб нашых безданнях?.. Эх, слёзы!” / В. Катавіцкі // Мастацтва Беларусі. – 1990. - № 10. – С. 14-17.

*Роздум падчас рэпетыцыі спектакля “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” паводле рамана У.С. Караткевіча ў Дзяржаўным маладзёжным тэатры БССР.*

143. **Катовіч, Т.** На ладдзі гарланілі песню…/ Т. Катовіч // Літаратура і мастацтва. – 2006. – 18 жніўн. (№ 33). – С. 11.

*Пра спектакль рэжысёра М. Краснабаева “Ладдзя Роспачы” на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску.*

144. **Клыга, А.** І адкрываецца для беларусаў Беларусь / А. Клыга // Гомельская праўда. – 1999. – 25 мая.*

*Пра спектакль “Дзікае паляванне караля Стаха” па аповесці У.С. Караткевіча, які быў пастаўлены ў Гомельскім абласным драмтэатры, рэжысёр У. Караткевіч.*

145. **Ключнікаў, А.** Непадуладнае цемры / А. Ключнікаў // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 19 кастр. (№ 42). – С. 10.

*Прэм’ера Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы “Сны аб Беларусі” паводле п’есы У.С. Караткевіча “Калыска чатырох чараўніц”.*

146. **Команава, Т.** Прывіды мінулага / Т. Команава // Культура. – 2006. – 7-13 студз. (№ 1). – С. 7.

*Пра спектакль “Дзікае палявання караля Стаха” рэжысёра У. Савіцкага.*

147. **Команава, Т.** Сны наяве / Т. Команава // Мастацтва. – 2007. – № 10. – С. 10-11.

*Аб спектаклі “Сны аб Беларусі” паводле У. Караткевіча, рэжысёра У. Савіцкага ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.*

148. **Куржалов, В.П.** Прагматики могут не смотреть / В.П. Куржалов ; записала Е. Ильянкова // Магілёўскія ведамасці. – 2008. – 25 лістап. – С. 11.*

*Беседа с режиссёром В.П. Куржаловым об инсценировке А. Дударева “Воробьиная ночь” по рассказу В. Короткевича “Паром на бурной реке”, в Могилевском областном драматическом театре.*

149. **Мазынскі, В.** “Я табе напісаў “Барыса Гадунова”… / В. Мазынскі // Літаратура і мастацтва. – 1987. – 4 верас. (№ 36). – С. 13-15.

*З успамінаў галоўнага рэжысёра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа аб сустрэчах з У.С. Караткевічам.*

150. **Мальдзіс, А.** Гісторыя, увасобленая ў драматычным дзеянні / А. Мальдзіс // Старыя беларускія хронікі / У.С. Караткевіч. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1988. – С. 298-302.

151. **Марціновіч, Дз.** Перачытаем "Каласы…"? / Дз. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 2008. – 18 крас. (№ 16). – С. 11.

*Прэм'ера спектакля "Каласы пад сярпом тваім". Сцэнічнае ўвасабленне беларускай класікі.*

152. **Орлова, Т.** В центре Минска шалят привидения / Т. Орлова // Рэспубліка. – 2005. – 9 снеж. – С. 6.

*Спектакль "Дикая охота короля Стаха" по одноименной повести В.С. Короткевича в Национальном академическом театре Я. Купалы.*

153. **Пастернак, Т.** Перешагнув 400 лет… / Т. Пастернак // Народнае слова. – 2005. – 29 лістап. – С. 5.

*Спектакль "Званы Віцебска" по пьесе В.С. Короткевича в Национальном академическом драматическом театре им. Я. Коласа.*

154. **Пепеляев, В.** Штудии Владимира Короткевича / В. Пепеляев //Советская Белоруссия. – 2008. – 27 марта. – С. 9.

*О новом спектакле Республиканского театра белорусской драматургии "Каласы пад сярпом тваім".*

155. **Пудзянкова, І.** Кароль Стах – у Магілёве / І. Пудзянкова // Культура. – 2010. – 15-21 мая (№ 20). – С. 9.

*Магілёўскі тэатр лялек.*

156. **Ракіцкі, В.** Сейбіт рэвалюцыйных ідэй / В. Ракіцкі // Голас Радзімы. – 1979. – 13 верас. – С. 7.*

*П'еса У.С. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі" ў Беларускім драматычным тэатры імя Я. Коласа.*

157. **Русаковіч, В.** Прывіды мінулага / В. Русаковіч // Культура. – 2006. – 7-13 студз. (№ 1). – С. 7.

*Спектакль "Дзікае паляванне караля Стаха" па аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.*

158. **Сабалеўскі, А.** Караткевіч ідзе… / А. Сабалеўскі // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 24 верас. (№ 38). – С. 11.

*Аб спектаклі "Цыганскі барон" па аднайменнай аповесці У.С. Караткевіча ў Брэсцкім тэатры драмы і музыкі.*

159. **Сабалеўскі, А.** Тэатральнае спасціжэнне Караткевіча / А. Сабалеўскі // Мастацтва. – 2001. - № 12. – С. 12-16.

*Пра ўвасабленне твораў пісьменніка на сцэне драматычных аматарскіх і лялечных тэатраў.*

160. **Савицкий, В.** Королевская охота отменяется? / В. Савицкий ; записал А. Смольский // Белорусская деловая газета. – 2004. – 14 сент. – С. 14.

*Беседа с режиссёром В. Савицким о спектакле «Дикая охота короля Стаха» по одноименной повести В.С. Короткевича в Национальном академическом театре им. Я. Купалы.*

161. **Савицкий, В.** Охота пуще «Охоты» / В. Савицкий ; записала А. Шадрина // Советская Белоруссия. – 2003. – 23 сент. – С. 4.

*Беседа с режиссёром В. Савицким о перспективах постановки спектакля «Дикая охота короля Стаха» по повести В.С. Короткевича в Национальном академическом театре им. Я. Купалы.*

162. **Савіцкі, У.** У снах і наяве / У. Савіцкі ; запісала Л. Грамыка // Мастацтва. – 2007. - № 7. – С. 40-41.

*Гутарка з рэжысёрам У. Савіцкім аб спектаклі "Сны аб Беларусі" па п'есе У.С. Караткевіча "Калыска чатырох чараўніц" у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.*

163. **Саннікаў, А.** "…І рабства ў ім навекі спапялі…" / А. Саннікаў // Літаратура і мастацтва. – 1979. – 12 студз. – С. 12-13.

*П'еса У.С. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі" у Беларускім драматычным тэатры імя Я. Коласа.*

164. **Сердзюкоў, М.** Пошук / М. Сердзюкоў // Гомельская праўда. – 1982. – 9 лют.*

*Пра спектакль паводле аповесці У.С. Караткевіча "Ладдзя Роспачы" ў Гомельскім абласным драматычным тэатры.*

165. **Скурко, А.** Караткевіч у галоўнай ролі / А. Скурко // Наша ніва. – 2005. – 16 верас. – С. 9.

